Рабочы Бабруйска

6 – 12 ліпеня 2000 г. Наклад 299 ас. Паштовы адрас: 213 807, Бабруйск, а/с 94, www.bobruisk.net. Рэдактар Ігар ХОДЗЬКА. №24

ЭХ, ЖИЗНЬ...

ЗАБЫТЫЙ ВЕТЕРАН

Наши власти, как хорошо обученные птицы-говоруны, по большим праздникам, таким, например, как День Победы или День Республики, привычно возносят хвалу «подвигу советского народа» и оставшимся в живых ветеранам Великой Отечественной. Но закончится праздник, отзвучат фанфары и ритуальные славословия, и про победителей фашизма благополучно забудут до следующей «памятной» даты. Как же – впереди «последний бой» с коварной, как американский шпион, экономикой или с явно наслушавшимся «вражьих голосов» «антисоветским» урожаем. Где уж тут помнить и чтить. Но оказывается, есть у нас еще и такие ветераны Отечественной, про которых власти и ветеранские организации не вспоминают даже и по праздникам, словно их не существует в природе.

Не думал, конечно, 81-летний коренной бобруйчанин Сергей Игнатьевич Синькевич, когда освобождал свой родной город и другие белорусские города, а затем «брал» Варшаву и Берлин, участвовал в знаменитом параде Победы на Красной площади в Москве, что пройдет 25 лет и он – ветеран войны – будет забыт. И где – в родном Бобруйске! Между тем, иначе, как забвением, ту ситуацию, в которой оказался Сергей Игнатьевич, назвать трудно. Судите сами: ни разу за 30 лет его не приглашали на торжественные собрания и концерты, посвященные Дню Победы или освобождения Беларуси, не вручали, как другим, цветов, праздничных подарков и материальной помощи, не предлагали, а наоборот, было дело, отказывали в путевке в санаторий. Более того, когда однажды Сергей Игнатьевич в очередной раз пошел на прием к бобруйскому мэру Владимиру Романовскому, надеясь решить свою жилищную проблему, то услышал из уст градоначальника такой вот «афоризм»: «У меня таких, как ты, тысячи». «Плюнул я тогда и решил: никогда больше сюда не пойду, – говорит ветеран. – Обидно, конечно, – раньше мы были нужны государству, а теперь...,» – горестно машет он рукой.

Война для Николая Игнатьевича началась под Брестом. Служил он тогда связистом. Во время отступления был ранен, попал в госпиталь, но, не долечившись, упросил начальника госпиталя отпустить его на фронт, к своим. И снова отступление – уже в пехоте. Жестокий рукопашный бой в Рогачеве, который и сейчас снится ветерану по ночам. Отступали до самой Рязани, а в декабре 1941 года пошли в наступление. До 1943 года их вновь сформированная часть стояла в обороне на реке Десне, что на Смоленщине. Затем – сражение на Курской Дуге. Наступление. Операция «Багратион». Освобождение Беларуси, Польши, Германии... И – Победа! На стене одного из берлинских домов, недалеко от Рейхстага, остался и его, Сергея Синькевича, автограф. После войны судьба побросала его по всей стране: несколько лет жил в Москве (ее освободителям легко было в столице прописаться), затем участвовал в восстановлении Донбасса. Работал на Севере. Вернулся в Донецк, да так и остался там. 20 лет проработал проходчиком в шахте. Общий трудовой стаж – 54 года. Целая человеческая жизнь! Уйдя на пенсию, вернулся в родной город. Жил у родственников, пока не сошелся с хорошей женщиной Фаиной Яковлевной. Она – вдова, он – вдовец. Словом, встретились два одиночества. Позже расписались.



Так уж сложилось, что не обзавелся Сергей Игнатьевич, как другие ветераны, благоустроенной квартирой. Живет он сейчас на втором этаже дореволюционного кирпичного дома в самом центре Бобруйска – на улице Социалистической, которую называют бобруйским Арбатом. Квартира его хоть и просторная для двух человек, но не благоустроенная. Нет горячей воды, обогреваются при помощи парового котла. Вот и приходится ему, инвалиду 2-й группы, таскать уголь, брикет, дрова по старинной крутой лестнице, по которой и молодой, тренированный мужчина не без труда поднимется. Но зимой паровое отопление не спасает: к утру температура в квартире понижается до 7 градусов тепла. Одним словом, не для стариков такие условия.

«Мы здесь не живем, а только мучаемся», – говорит по этому поводу Фаина Яковлевна. А хотят они, в сущности, не так уж много: обменять свою трехкомнатную квартиру на двухкомнатную благоустроенную. Или чтобы из городского жилищного фонда Сергею Игнатьевичу однокомнатную квартиру выделили. Разве не заслужил ее освободитель Бобруйска?

Кроме местных властей, обращались они и к Лукашенко – два письма ему написали. Но из администрации «батьки» обращения неизменно пересылают мэру Бобруйска. А у того ответ один: «Нет возможности». Для проведения «в лучших традициях» прошлых времен первомайских демонстраций, для проведения «пира во время чумы» – Дня города, для возведения московского калибра памятника погибшим воинам – деньги есть, а для строительства квартиры живому ветерану – «нет возможности».

Несколько лет тому назад на первом этаже того дома, где живет Сергей Игнатьевич, делали ремонт. Дом тогда выглядел, как после вражеского обстрела: на первом этаже не было ни окон, ни дверей, – все развалено, только ветер гуляет. И проходили как-то мимо мэр с главой жилищно-коммунального хозяйства этого района города. Один глянул, другой. А стоявший там Сергей Игнатьевич им и говорит: «Видите, в каких условиях живу? А ведь я здесь и зимовал (дело было летом – прим. авт.)! Мэр возмутился: «Что вы сочиняете!» – «Я не сочиняю, а факты говорю, – ответил ему Сергей Игнатьевич. Называется, встретились – поговорили. Правда, в 1995 году поставили все же Сергея Игнатьевича на льготную очередь в горисполкоме. Но движется она, как «завещал» великий Ленин: шаг вперед, два – назад. Если, например, в прошлом году они с Фаиной Яковлевной были на одиннадцатом месте, то в этом – уже тридцать первые.

Говорят, две льготные очереди объединили в одну... Но кому от этих оправданий легче?

А недавно в магазине Сергей Игнатьевич услышал в свой адрес слова, которые ударили по нему, как автоматная очередь: «Если бы не вы, мы давно бы уже баварское пиво пили и немецкими сосисками закусывали».

Сергей Игнатьевич не раз заглядывал смерти в глаза, оказывался в отчаянном положении, но всегда в нем побеждала любовь к жизни. Теперь же он с горечью говорит: «Лучше бы меня там убили, чем так жить и слышать такое.»

Анатолий САНОТЕНКО.

На снимке: *эту «крепость» 81-летний ветеран готов «сдать» государству.*

РЭАЛІІ

«Не падабаецца — за вароты!»

З 19 чэрвеня ў адпачынак адпраўлены працаўнікі народнага аб'яднання «Бабруйскмэбля». Аднак адпускныя (па стану на 3-га ліпеня) дагэтуль так і не выплачаны.

Па словах рабочых, за апошні час на прадпрыемстве шмат чаго змянілася, але на жаль, усе гэтыя перамены са знакам «мінус». Яны сцвярджаюць, што іх адміністрацыя «не зусім чыстая на рукі», а начальнікі, якія былі злоўленыя і затым пакараныя, праз два-тры гады ідуць на павышэнне па службовай лесвіцы. Далей. Рабочых не задавальняе тое, што каэфіцыент працоўнага ўдзелу замест савета брыгады (як было раней) цяпер вызначае начальнік з майстрам. У выніку такой дзяльбы атрымоўваецца звычайная ўраўнілаўка. А нядаўна, хоць умовы працы менш шкоднымі і не сталі, працуючым з клеем, з ДСП, станочнікам..., перасталі даваць малако.

На натуральнае абурэнне рабочых адміністрацыя заўсёды адказвае дзяжурнай фразай: «Не падабаецца — ідзіце за вароты!»...

Віктар КУЛІКОЎ.

Выпадковасць ці загад?

Працаўніца з прадпрыемства "Бабруйсктрыкатаж" патэлефанавала да нас і паведаміла: на прадпрыемстве існуе паслуга атрымліваць розныя рэчы-харчы ў лік заробка, таксама магчыма падпісацца на газеты. Калі яна паспрабавала падпісацца на "Свободные новости", у яе нічога не атрымалася, бо ў спісе адсутнічалі газеты, якія прытрымліваюцца апазіцыйных поглядаў. Выпадковасць? Наўрад ці.

ПЕРСОНА

Ольга Чайцина:

"Нас всю жизнь учили с чем-то бороться. А я хочу научить созидать"

Оставив за спиной "темное" комсомольско-пионерское прошлое, наше общество так и не сумело прийти к светлому настоящему. В умах и сердцах молодежи разброд и шатание, подспудное желание найти себя, свое дело и авторитетного для них человека, который поможет определиться. Жизнь свела меня с таким человеком. Знакомьтесь – Ольга Чайцина, председатель Совета Бобруйского Христианского Содружества Взрослых и Молодых (ХСВМ). Эта молодая женщина объединила вокруг себя около ста таких же молодых людей, детей и подростков.

– ***Ольга, в чем «соль» вашей организации?***

– У бобруйской ХСВМ имеются три магистральных направления деятельности.

Скаутинг – целый комплекс, который помогает подростку жить в гармонии с собой, с обществом, окружающей средой. Включает в себя обучение азам психологии, краеведения, экологии, технике туризма, оказанию первой медицинской помощи.

Тенсинг – пласт молодежной и подростковой культуры, включающий в себя пение, танцы, сценки.

Социальная помощь, осуществляемая в рамках студии "Солнышко". Студия работает с детьми-сиротами бобруйского детского дома, устраивает спектакли, концерты, праздничные вечера. Руководителем этой студии на протяжении вот уже девяти лет является Наталья Юрьевна Попова.

Мы не религиозная, не политическая организация. Свою задачу я вижу в том, чтобы помочь молодым людям обрести гармонию с собой, научить терпимости. Ведь нас всегда учили бороться, но так и не научили создавать. Если мы с чем и боремся, так это с трудностями своего характера.

– ***А как вы сами шагнули на стезю общественной деятельности?***

– Я по профессии педагог, до 1997 года работала в школе. У нас был "турдрамкружок", с ребятами мы ставили спектакли, показывали их. Затем – скауты, и в какой-то момент я поняла, что нужно организовываться, нужна своя организация и устав. И тогда же, а это было в 1997 году, я встретила людей, которые помогли создать локальную организацию ХСВМ в Бобруйске.



– ***Вы председатель Совета ХСВМ. Звучит очень громко. А как в действительности?***

– Каждое наше направление имеет своих лидеров, мы встречаемся, вырабатываем совместные планы, делимся мыслями, думаем о будущем, планируем настоящее.

– ***Пару слов о планах.***

– Этим летом нас ждет скаутский лагерь в Красном, также мы являемся организаторами интернационального скаутского лагеря в Беларуси, и четверо наших ребят примут участие в интернациональном скаутском лагере во Франции.

Еще готовимся к "Тенсинг – фестивалю", который состоится в ноябре. В общем, как писал Маяковский, "планов – громадье"!

Беседовала Надежда КОКАШ.



СПОРТ

"БЕЛШЫНА": УСЁ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА

28 чэрвеня ў 12 туры чэмпіяната краіны па футболу ў вышэйшай лізе бабруйская "Белшына" прымала "Днепр-Трансмаш" з Магілёва. Госці прыехалі да нас у прыўзнятым настроі – у кубку Інтэртота яны здолелі прайсці дацкі "Сількеборг", які ў сістэме еўрапейскіх футбольных каардынат знаходзіцца далёка не на апошнім месцы.

На матч "Белшына" выйшла ў наступным складзе: варатар Жэмчугаў, абаронцы – Балтрушэвіч, Клімовіч, Хрыпач, Шагойка, паўабаронцы – Свердлаў, Азараў, Кашкар, Банул, нападаючыя – Балашоў і Каролік.



Каманды пачалі без разведкі, спрабуючы шукаць шчасце ля чужых варот. Першы небяспечны момант стварылі госці. Індывідуальны рэйд у варожы тыл здзейсніў абаронца гасцей Баранаў – выратаваў Жэмчугаў. Бабруйчане адказалі не менш вострa. Банул, выконваючы штрафны, навесіў на Клімовіча, удар у апошняга атрымаўся някепскім, але і трохі недакладным. На 35-й хвіліне хтосьці з абаронцаў гасцей, перахопваючы палёт мяча на ўласнай штрафной, падгуляў сабе рукой. Свісток суддзі прамаўчаў – ці на самой справе не бачыў, ці зрабіў выгляд... І ўсё ж справядлівасць перамагла: праз хвіліну пасля падачы вуглавога Хрыпачом лік ударам галавой адкрыў Кашкар.

У пачатку другога тайма магіляўчане за кошт уводу ў бой "свежых ног" узмацнілі націск. У цэнтральнай зоне завязіўся з мячом Свердлаў. Перахоп – контратака – пенальці. Удар Агародніка Жэмчугаў бярэ, але ўсіх апярэджвае форвард гасцей – 1:1. Потым "Днепр", стомлены дацкім ваяжам, пачаў пацiху здаваць, а гаспадары, наадварот, быццам бы другое дыханне адкрылася, загулялі яшчэ хутчэй і весялей. І ў рэшце рэшт на 76-й хвіліне Балтрушэвіч са штрафнога выводзіць "Белшыну" наперад. Хвалі ўзаемных атак працягваліся аж да самага заканчэння гульні. На яе апошніх хвілінах Дземідчыка (выйшаў на замену) госці завалілі ў штрафной пляцоўцы -- 11-метровы! Зноў адзначыўся Балтрушэвіч. 3:1 – і, што цікава, усе галы ў гульні былі забіты з выкарыстаннем стандартных становішчаў.

І яшчэ адзін штрых да матча. Палотнішча магілёўскіх балельшчыкаў з бяскрыўдным надпісам «River lions» (Рачныя львы), якое ў пачатку паядынку было замацаванае на плоце, што адгарадзіў будоўлю "паўночных" трыбун, ахоўнікі правапарадку загадалі зняць: "Не положено!". Але ж махаць сінімі (колер "Дняпра") шалікамі фанатам усё ж дазволілі. Хто сказаў, што бабруйскай міліцыі гуманнасць не ўласціва?

Песімістычныя настроі аматараў футбола зараз змяніліся на дыяметральна процілеглыя. Апошнія вынікі і, што яшчэ больш пераканальна, замест гэтых матчаў, зноў уваскрасілі пагаслыя было надзеі. І, хоць зараз "Белшына" з 20-цю ачкамі знаходзіцца быццам бы на далёкім сёмым месцы (наперадзе "Славія" з Мазыра – 30 і салігорскі "Шахцёр" – 24), але ад ідучага трэцім ФК "Гомель" бабруйчан аддзяляе ўсяго два ачкі! Усё толькі пачынаецца?

Віктар КАЧАН.

МІНУЛАЕ — СУЧАСНАЕ

РЫЦАРЫ СЫШЛІСЯ Ў НАВАГРУДКУ



24-25 чэрвеня старажытны Навагрудак быў узяты ў аблагу вялікім войскам крыжакоў, турыстаў, музыкантаў, журналістаў. Каля дзесяці тысяч гледачоў з усёй Беларусі з'ехаліся, каб пабачыць бойку крыжакоў і абаронцаў сярэдневяковага замка, акунуцца ў паветра старажытнага горада. Каля пяцісот рыцараў з Беларусі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Эстоніі, Расіі рыхтаваліся, як у 1314 годзе, пайсці на прыступ першай сталіцы беларусаў.

Азірнемся ў гісторыю. У верасні 1314 вялікае войска крыжакоў на чале з магістрам тэўтонскага ордэна Гэнрыхам фон Плоцкэ асадзіла замак і пачало штурмаваць яго з дапамогай камянямётаў. Адначасова немцы рабавалі наваколле. Першыя прыступы іншаземцаў былі няўдалыя. Абаронцы мужна трымаліся, адбіваючы ворага.

І неўзабаве да іх на дапамогу прыйшоў гродзенскі кашчелян Давыд з конным атрадам. Давыд захапіў лагер крыжакоў і знішчыў усе запасы харчу і 1500 коней.

Немцы хутка знялі аблогу і пабеглі да Кёнігсберга. (Дарэчы, у 1314 годзе Давыд напаў на Прусію і захапіў правінцыю Вегендорф, у 1323 вызваліў ад крыжакоў Пскоўскія землі і асадзіў Рэвель у сучаснай Эстоніі, а ў 1326 годзе напаў на Брандэрбург і асадзіў Франкфурт-на-Одэры.)

У гэты раз крыжакам былі рады і не гналі іх далей ад горада. Свята пачалося парадам рыцараў. Цікава, што сярод дзяржаўных сцягаў краін-удзельніц спачатку не было беларускага. Калі ж пад вечар ён з'явіўся, то выглядаў вельмі недарэчна побач з гістарычнымі сцягамі Латвіі, Расіі, Польшчы і Літвы.

Бліжэй да апоўдня адбылося коннае рыстаlішча, бугурт – пешая бойка, штурм замка. Рыцары спаборнічалі ў валоданні зброяй, уменні трымацца ў сядле, правіць канём. Асобна трэба падкрэсліць тое, што нягледзячы на вялікую колькасць турыстаў і выпітага піва, свята не было сапсавана ніякімі непрыемнымі здарэннямі. Міліцыянты вельмі паважана паводзілі сябе са шматлікімі наведвальнікамі Навагрудка, нават спрадвечныя нацыянальныя сімвалы і магутнае "Жыве Беларусь!" не нервавалі вартавых парадку. Напэўна яны разумеюць, што калі шасцігадовыя дзяўчынкі размахваюць бел-чырвона-белымі сцяжкамі і разам з іншай моладзю крычаць: "Жыве Беларусь!", у гэтым нешта ёсць. І яшчэ. Канешне, былі недахопы, не хапала рэкламы. Аднак мы верым, што далей будзе найлепш.

Т. КУДРЫНА, Т. ГАЎРЫЛАВА.

РЭАЛІІ

Чым карміць жывёлу зімой?

Сёння менавіта гэтае пытанне не дае спакойна спаць кіраўнікам гаспадарак Бабруйскага раёна. Па стану на пачатак мінулага тыдня толькі 19 працэнтаў да плана нарыхтавана ў раёне сена і 23 працэнты сенажу. І гэта нягледзячы на тое, што скошана ўжо палова ўсёй плошчы! Відавочна – у лепшым выпадку паказчыкі выканання плану не перавысяць 50%.

А на прадпрыемствы і ў навучальныя ўстановы горада ўжо ідуць паперы-распараджэнні аб абавязковай дапамозе сялу ў нарыхтоўцы сена.

А. ЛІЦЬВІНАЎ.

КРЫМІНАЛ

Кількі замест селядцоў

У першы ліпеньскі дзень а 16-й гадзіне ля крамы "Жар-птушка" супрацоўнікам міліцыі была затрымана жанчына, якая гандлявала селядцамі ў бляшанках. Калі верыць напісанаму на этыкетцы, прадукт быў расійскай вытворчасці (г. Мурманск), важыў 600 грам, і столькі ж рублёў каштаваў. Умераны кошт садзейнічаў добрай раскупляемасці. Ды раптам аднаго з пакупнікоў насцярожыла тое, што бляшанкі былі з трохі пратэрмінаванай датай захоўвання. Пры распакоўцы выявілася, што замест селядцоў там знаходзілася пратухлая кілька. Тыя з пакупнікоў, кто яшчэ не паспеў далёка адыйсці, тут жа пачалі здаваць тавар назад, але грошай хапіла толькі тром з іх. На пытанні абураных людзей з набытымі бляшанкамі ў руках: "Дзе ж астатнія грошы?" адказаць тая так і не здолела. Сведкі сцвярджаюць, быццам бы яна была не адна, побач з ёю бадзяліся асобы цыганскай нацыянальнасці. А перад гандлем ля "Жарптушкі" махлярка "стрыгла купоны" і ля прадуктовай крамы № 61, што знаходзіцца паблізу ад месца здарэння. Разам з пацярпелымі пакупнікамі прыйшлося ёй накіравацца па яшчэ адным, ужо крыху больш далёкім маршруце – у аддзяленне міліцыі...

Віктар КАЧАН.

АДУКАЦЫЯ

КУДЫ ПАЙСЦІ ВУЧЫЦЦА.., І ДЗЕЛЯ ЧАГО?

Вось і скончыўся час выпускных экзаменаў і баляў. Учарашняе ганаровае званне "школьнік" для многіх бабруйскіх падлеткаў паступова змяняецца на яшчэ больш ганаровае — "абітурыент".

Чакаецца, што больш за палову выпускнікоў 9-11-х класаў працягнуць набыццё ведаў у навучальных установах горада. Многіх з іх зараз хвалюе пытанне: "Куды пайсці вучыцца?" Але, можа, спачатку нялішнім будзе адказаць сабе яшчэ на адно: "Дзеля чаго?" Калі дзеля атрымання вышэйшай адукацыі, крытэрыі выбару будуць адны. Калі дзеля знаходжання ў будучым добрага працоўнага месца - крыху іншыя. І тут трэба памятаць аб абавязковым размеркаванні і аб тым, што ад яго дастаткова складана адкруціцца.

Каб дапамагчы знайсці адказ на такія складаныя пытанні, прапануем інфармацыю аб тым, куды і каго здолелі ўладкаваць на работу некаторыя навучальныя гарадскія ўстановы. Бабруйскі лесатэхнікум, які рыхтуе ў асноўным спецыялістаў у галіне дрэваапрацоўкі, уладкаваў у мінулым годзе каля 92% сваіх выпускнікоў, у асноўным на прадпрыемствы горада – ФанДАК, Мэблевую фабрыку імя Халтурына. Сярэдні заробак рабочага на ФанДАКу (а ў асноўным размеркаванне было на рабочыя месцы) складае зараз каля 20-30 тысяч рублёў, на «Халтурына» крыху больш. Таксама выпускнікі размяркоўваліся ў розныя беларускія гарады і мястэчкі, нават у Брэсцкую вобласць. Дарэчы, летась конкурс пры паступленні складаў 2-3 чалавекі на месца.

Бабруйскі сельскагаспадарчы тэхнікум, які рыхтуе спецыялістаў па будоўлі, правазнаўству, бухгалтарскім уліку, размяркоўвае сваіх навучэнцаў па вёсках Магілёўскай вобласці, у тым ліку і ў забруджаныя радыяцыяй зоны.

Трэба адзначыць, што ў гэтым годзе па спецыяльнасці «Бухгалтарскі ўлік і правазнаўства» чакаецца вялікі конкурс – каля 5 чалавек на месца (летась – 3). Але не трэба адчайвацца, з 360 навучэнцаў, якія ў гэтым годзе прыйдуць у тэхнікум, 150 будуць навучацца платна. Калі вы здолееце атрымаць "тры" на іспытах і заплаціць 60 мінімальных зарплат, калі ласка – вучыцеся.

Бабруйскі механіка-тэхналагічны тэхнікум уладкоўвае каля 50-60% сваіх навучэнцаў. Прычым назіраецца вялікая розніца па розных спецыяльнасцях – калі механікаў машын і апаратаў уладкоўваюць амаль што ўсіх (да 80% бярэ БШК "Белшына"), дык аналітыкам знаходзіцца праца толькі ў 30% выпадкаў. Для тых, хто навучаецца па спецыяльнасці "электратэхніка", маецца вялікі плюс – дамова з Палітэхнічнай акадэміяй, многія пасля заканчэння БМТТ па гэтай спецыяльнасці паступаюць у ВНУ. І ўвогуле, БМТТ дае вельмі высокі ўзровень падрыхтоўкі для ВНУ, і не вельмі высокі працэнт працаўладкаваных можна растлумачыць яшчэ і тым, што шмат хто з выпускнікоў становіцца студэнтам ВНУ.

Аўтатранспартны тэхнікум ўладкоўвае каля 60% сваіх выпускнікоў, і ў асноўным па-за межамі Бабруйска. Калі жадаеш уладкавацца ў горадзе – шукай сам. І ў Аўта-, і ў Хімтэхнікум леташні конкурс пры паступленні складаў каля трох чалавек на месца.

Завяршыць свой няпоўны агляд мне б хацелася Бабруйскім медвучылішчам. Амаль што ўсе леташнія выпускнікі, а гэта 236 медсясцёр і 64 фельчара, былі працаўладкаваны ў паліклінікі і бальніцы горада. Толькі 15 чалавек, тыя, хто навучаўся на платнай аснове ці працаваў па-за межамі Бабруйска, атрымалі свабодныя дыпломы. Іншая рэч – зарплаты, ні, як вядома, у нашых медыкаў вельмі малыя.

Шаноўныя абітурыенты! Я жадаю вам удачы і поспеху. Думайце, вырашайце, і хай атрыманая вамі адукацыя будзе менавіта той, што прыйдзецца да ладу ў вашым жыцці.

Надзея КОКАШ.